# Мова – крыніца ўсёй прыгажосці
## (план правядзення тыдня мовы ва ўстанове дашкольнай адукацыі)

**Мэта:** фарміраванне ўстойлівай цікавасці і станоўчых адносін да беларускай мовы, жаданне авалодаць ёю, развіццё навыкаў разумення беларускай мовы, пазнавальнай актыўнасці; выхаванне любові да Раздімы, роднага краю, пачуццё гонару за сваю краіну

| Дні тыдня | Тэмадня | Тэма мерапрыемства | Від дзейнасці | Мэта | Удзельнікі | Адказныя |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Панядзелак | “Мой край завецца Беларуссю” | “Родная мова ў сістэме дашкольнай адукацыі” *(семінар-практыкум)* | Метадычная | Павысіць прафесійную кампетэнтнасць педагогаў па пытаннях развіцця маўлення і культуры маўленчых зносін | Педагогі | Намеснік загадчыка па асноўнайдзей насці |
| | | “Як гэтасказаць па-беларуску?” *(вырашэнне праблемных сітуацый)* | Зносіны | Актывізаваць уменне дзяцей разважаць, прагназаваць развіццё падзей; выклікаць усвядомленае жаданне даведацца, як гэта называецца па-беларуску | Выхаванцы старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Складзі сцяг, герб, карту Беларусі” *(дыдактычная гульня)* | Гульнявая дзейнасць | Практыкаваць у складанні цэлага малюнка з частак, праз змест малюнкаў замацоўваць веды пра дзяржаўныя сімвалы Беларусі | Выхаванцы старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Цяпер я ведаю, якая Беларусь”, “Адкуль пайшлі беларусы” *(чытанне твораў пра Радзіму)* | Мастацкая дзейнасць | Паглыбляць веды пра сваю краіну; выхоўваць пачуццё нацыянальнай годнасці, гонару за сваю Радзіму; узбагачаць слоўнікавы запас | Выхаванцы сярэдніх і старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Ля карты Беларусі ” *(разгляд карты Беларусі)* | Пазнавальная практычная дзейнасць | Падтрымліваць цікавасць да пазнання роднай краіны; удакладніць звесткі пра геаграфічныя асаблівасці Беларусі; фарміраваць уменне элементарна арыентавацца на карце | Выхаванцы сярэдніх і старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | “Выхоўваем маленькага беларуса” *(анкетаванне)* | Узаемадзеянне з сем’ямі выхаванцаў | Выяўленне адносін да дзіцячых кніг на беларускай мове | Законныя прадстаўнікі выхаванцаў | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Эфектыўныя метады і прыёмы па азнаямленні выхаванцаў сярэдняй і старэйшай груп з беларускімі народнымі казкамі” *(кансультацыя)* | Праца з педагагічнымі работнікамі | Удакладніць веды педагогаў пра эфектыўныя метады і прыёмы па азнаямленні выхаванцаў з беларускімі народнымі казкамі на занятках і ў паўсядзенным жыцці | Педагогі | Намеснік загадчыка па асноўнайдзей насці |
| Аўторак | “Старонкі з малой скарбонкі” | “Літаратурнае падарожжа” *(чытанне забаўлянак, вершаў, беларускіх народных казак)* | Мастацкая дзейнасць | Знаёміць дзяцей з забаўлянкамі і вершамі, з народнымі казкамі на беларускай мове; далучаць да багацця роднай мовы; узбагачаць эмацыянальную сферу выхаванцаў | Выхаванцы ўсіх узроставых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Славутыя сыны Беларусі” *(экскурсія ў бібліятэку)* | Пазнавальная практычная дзейнасць | Далучаць да багацця літаратурнай спадчыны, пазнаёміць з творчасцю беларускіх пісьменнікаў; развіваць цікавасць да іх творчасці; выхоўваць павагу да пісьменнікаў роднай краіны | Выхаванцы старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Залатая скарбонка” *(вечарыназагадак)* | Мастацкая дзейнасць | Актывізаваць прадстаўленні пра беларускія народныя казкі; замацоўваць уменне пазнаваць казку па ўрыўку; развіваць гаворку; выхоўваць любоў да беларускай літаратуры | Выхаванцы старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Казачнае лата” *(дыдактычнаягульня)* | Гульнявая дзейнасць | Замацоўваць веданне беларускіх народных казак; фарміраваць уменне пазнаваць казку па малюнках (урыўках), раскладваць ілюстрацыі ў адпаведнай паслядоўнасці; развіваць мастацка-маўленчую дзейнасць | Выхаванцы сярэдніх і старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Беларускія народныя казкі” *(арганізацыя міні-выставы ў кніжным кутку)* | Зносіны | Фарміраваць уменне ўважліва разглядаць карцінкі да беларускіх народных казак, пазнаваць герояў, іх дзеянні, падтрымліваць цікавасць да беларускіх народных казак | Выхаванцы малодшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Славутыя імёны Беларусі” *(арганізацыя міні-выставы ў кніжным кутку)* | Зносіны | Далучаць выхаванцаў да багацця літаратурнай спадчыны; падтрымліваць цікавасць да творчасці пісьменнікаў роднай краіны | Выхаванцы сярэдніх і старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | “Народная беларуская казка” *(выстава сумеснай творчасці бацькоў і дзяцей)* | Узаемадзеянне з сем’ямі выхаванцаў | Фарміраваць уменне перадаваць сюжэт казкі ў малюнку, выхоўваць цікавасць да беларускіх народных казак | Законныя прадстаўнікі выхаванцаў, выхаванцы | Намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці, выхавальнікі |
| Серада | “Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына” | “Запрашаем у “беларускую” хатку” *(відэаэкскурс)* | Пазнавальная практычная дзейнасць | Пашыраць веды дзяцей пра жыццё беларускіх сялян у былыя часы;<br>працягваць знаёміць з асаблівасцямі сялянскіх пабудоў, іх інтэр’ерам, прыладамі працы, посудам, адзеннем;<br>выхоўваць павагу да гістарычнага мінулага сваёй кріаны;<br>узбагачаць слоўнікавы запас | Выхаванцы старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Беларускае нацыянальнае адзенне” *(дэфіле)* | Музычная дзейнасць | Фарміраваць уяўленні пра асаблівасці нацыянальнай культуры, традыцый беларусаў, знаёміць з беларускім нацыянальным адзеннем, яго своеасаблівай прыгажосцю;<br>даць звесткі пра асноўныя кампаненты народнага касцюму | Выхаванцы старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі, музычны кіраўнік |
| | | “Народныя майстры” *(наведванне выставы твораў народных майстроў)* | Зносіны | Пазнаёміць з творамі народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;<br>падтрымліваць жаданне пазнаваць культуру роднай зямлі | Выхаванцы срэдніх і старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнайадукацыі |
| | | “Іванка і Аленка апранаюцца ў беларускі касцюм” *(дыдактычная гульня)* | Гульнявая дзейнасць | Замацоўваць веды пра асаблівасці беларускага касцюма, яго кампаненты;<br>выклікаць цікавасць да гістарычнай спадчыны, выхоўваць павагу да яе | Выхаванцы сярэдніх і старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| Чацвер | “На роднай мове размаўляю” | “Вы паслухайце родную мову–жаўруковаю песняй звініць” *(кніжная выстава)* | Узаемадзеянне з сем’ямі выхаванцаў | Далучаць да паэзіі роднай мовы, выклікаць цікавасць да яе;<br>выхоўваць жаданне да чытання твораў беларускіх аўтараў | Законныя прадстаўнікі выхаванцаў | Намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | "Шануйце родную мову" *(кансультацыя)* | Праца з педагагічнымір аботнікамі | Выхоўваць любоў і павагу да роднай мовы | Педагогі | Намеснік загадчыка па асноўнайдзей насці |
| | | "Мовародная мая" *(гутарка)* | Зносіны | Далучаць да паэзіі роднай мовы; фарміраваць уменне вырашаць з дапамогай роднай мовы камунікатыўныя і пазнавальныя задачы; выклікаць асэнсаванае жаданне авалодаць роднай мовай | Выхаванцыіся рэдніх і старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | "Птушкі і жывёлы Беларусі" *(беларускі слоўнік)* | Зносіны | Пашыраць слоўнікавы запас выхаванцаў па тэме "Птушкі", "Жывёлы" | Выхаванцы сярэдніх і старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | "Жывёльны свет Беларусі" *(дыдактычнае лато)* | Гульнявая дзейнасць | Замацоўваць веды пра жывёл, што жывуць у лясах, вадаёмах, на лугах Беларусі; развіваць зацікаўленасць | Выхаванцы сярэдніх і старэйшых групп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | "Немаўклівыя паштоўкі" *(сюжэтна-гульнявы комплекс)* | Гульнявая дзейнасць | Замацаваць і актывізаваць у слоўніку дзяцей назвы прадметаў школьных прылад, адзення; увесці ў актыўны слоунік дзяцей новае слова "стыліст"; фарміраваць уменні ўзнаўляць словы з нагляднай падказкай, разумець беларускую мову; пашыраць веды выхаванцаў пра асаблівасці беларускага адзення, працу стыліста; фарміраваць уменні творча развіваць сюжэт гульні, падтрымліваць дыялог у адпаведнасці з роллю; развіваць цікавасць да працы стыліста; выхоўваць жаданне размаўляць па-беларуску | Выхаванцы старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | "Простая беларуская ежа" *(відэатэка)* | Узаемадзеянне з сем'ямі выхаванцаў | Удакладніць звесткі пра беларускія стравы | Законныя прадстаўнікі выхаванцаў | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| Пятніца | "Бяздоннае багацце" | "Мова – крыніца ўсёй прыгажосці" *(праца з лэпбукам)* | Пазнавальная практычная дзейнасць | Замацаваць і сістэматызаваць уяўленні выхаванцаў па тэме "Беларусь – наша краіна" | Выхаванцы сярэдніх і старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | “Беларускія народныя гульні” *(развучванне беларускіх народных гульняў)* | Гульнявая дзейнасць | Уводзіць дзяцей у багаты свет народных гульняў; развіваць сілу, кемлівасць, спрыт | Выхаванцы ўсіх узроставых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Старажытныя святы” *(віртуальны экскурс)* | Пазнавальная практычная дзейнасць | Пашыраць уяўленні пра старажытныя народныя святы беларусаў; развіваць цікавасць да народных традыцый | Выхаванцы сярэдніх і старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Славутыя мясціны Беларусі” *(дыдактычная гульня)* | Гульняваядзей насць | Замацоўваць веды правядомыямясціныБеларусі; развівацьмову, уменнецікавараcказваць праіхгісторыю | Выхаванцы старэйшых груп | Выхавальнікі дашкольнай адукацыі |
| | | “Свята цацкі” *(кірмаш)* | Музычная дзейнасць | Замацоўваць уяўленні пра беларускія народныя цацкі, даставіць выхаванцам радасць | Выхаванцы старэйшых груп | Музычны кіраўнік |
| | | “Беларускія народныя гульні як сродак далучэння дзяцей да беларускай нацыянальнай культуры” *(сямейная гасцёўня)* | Узаемадзеянне з сем’ямі выхаванцаў | Пазнаёміць з беларускімі народнымі гульнямі; даць звесткі пра іх ролю ў далучэнні дзяцей да беларускай нацыянальнай культуры | Законныя прадстаўнікі выхаванцаў | Намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці, выхавальнікі дашкольнай адукацыі |